ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі "Гомельскі абласны
інстытут развіцця адукацыі"
В.Л.Акуленка
.03.2017

**Заданні другога этапу абласной алімпіяды навучэнцаў IV-IX класаў па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" 2016/2017 навучальны год**
**VII клас**

**Заданне 1.** Вызначце, да якой часціны мовы адносіцца выдзеленае слова.

| | | |
|---|---|---|
| 1. | У мінулым годзе мы купілі невялікі ўчастак ***паблізу*** горада. | |
| 2. | Цеснавата, ***затое*** весела. | |
| 3. | Вясна прыйшла ***і*** на Беларусь. | |
| 4. | ***Насустрач*** нам выйшаў гаспадар. | |
| 5. | ***Вакол*** ляжала маўклівае пустое поле. | |

**Заданне 2.** Запішыце да наступных словазлучэнняў рускай мовы адпаведныя словазлучэнні беларускай мовы:

1) издеваться над животным;
2) болеть гриппом;
3) читать про себя;
4) дом в пять этажей;
5) похожий на отца;
6) не выполнить из-за лени;
7) заведующий библиотекой;
8) несколько раз в неделю;
9) благодарить маму;
10) своими ушами слышать.

**Заданне 3.** Пастаўце і запішыце назоўнікі ў родным склоне.

1. На прыпынку шмат народ…;
   Дасягненні беларускага народ…
2. Не чуваць ні гук…;
   вымаўленне зычнага гук…
3. Надышоў час лістапад…;
   канец месяца лістапад…
4. Падысці да тэлефоннага апарат…;
   органы дзяржаўнага апарат…
5. Каля міліцэйскага паст…;
   прытрымлівацца строгага пост…

**Заданне 4.** Запішыце лічэбнікі словамі, пастаўце словазлучэнні ў творным склоне.

1. 30 студэнтаў
2. 48 дрэў
3. 205 вучняў
4. 115 сталоў
6. 75-ты год
7. 563 студэнты

**Заданне 5.** Запішыце правільна сказы з дзеепрыметнікамі, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы.

1. На кожным кроку ляжаць старыя калоды, пакрыўшыеся зверху зялёным аксамітам моху.

2. Між пясчаных узгоркаў заслаўшых мохам, ляжала лагчына.
3. У нерушы мы натрапім на лясное возера, атуліўшаеся звонкай цішынёй.

**Заданне 6.** Узнавіце вядомыя фразеалагізмы.

1. Фількава …
2. Ахілесава …
3. Гордзіеў …
4. Дзясятая вада на …

**Заданне 7.** Разбярыце словы па саставу.

| *Слова* | *прыстаўк а* | *корань* | *суфікс* | *канчатак* | *постфікс* |
|---|---|---|---|---|---|
| сарваўся | | | | | |
| аснежаныя | | | | | |
| зверху | | | | | |
| вынаходнік | | | | | |
| сучаснік | | | | | |

**Заданне 8.** Зрабіце фанетычны запіс слоў.

З поля, з лесу, ястраб, праз цябе, суседскі, расчасаць, дзядзька, зжаць, на рэчцы, экзамен.

**Заданне 9.** Пра пэўны жанр вядома, што гэта мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі. Гэта жанр:

1) апавяданне; 2) казка; 3) аповесць; 4) легенда; 5) навела.

**Заданне 10.** Вызначце, да якіх твораў адносяцца героі.

А. Алена Васілевіч “Сябры — 1. Кастусь, дзед Агей
Б. Генрых Далідовіч “Страта” — 2. Тэкля, Лаўрук
В. Змітрок Бядуля “На каляды к сыну” — 3. Міця Бокуць, Стасік
4. Лёня, Грышка

А. Б. В.